# Праблемнае навучанне як сродак фарміравання чытацкай адукаванасці вучняў

**Кампанеец Святлана Юльянаўна,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
кваліфікацыйнай катэгорыі
«настаўнік-метадыст»
Радунскай сярэдняй школы
Воранаўскага раёна

Сучасныя школьнікі — гэта дзеці, якія жывуць, вучацца і выхоўваюцца ў эпоху хуткага тэхналагічнага развіцця і доступу да любой інфармацыі. Сацыяльныя сеткі, анлайн-платформы і розныя дадаткі выкарыстоўваюцца імі і ў жыцці, і для навучання. Вучні больш візуальна арыентаваныя, мысляць кліпава, схільныя да хуткага і павярхоўнага чытання. Паступова яны страчваюць здольнасць чытаць і інтэрпрэтаваць тэкст, успрымаць і засвойваць яго поўнасцю і глыбока. Таму вельмі важна развіваць уменне вучняў працаваць з тэкстам, разумець, якіх мэт спрабуе дасягнуць яго аўтар, вызначаць галоўную і другасную інфармацыю.

У 2018 годзе Рэспубліка Беларусь упершыню прыняла ўдзел у даследаванні PISA, ключавым напрамкам якога стала чытацкая адукаванасць — здольнасць чалавека разумець, ацэньваць і выкарыстоўваць тэксты, усвядомліваць іх і быць зацікаўленым у працэсе чытання для дасягнення сваіх мэт, пашырэння сваіх ведаў і магчымасцей, усебаковага ўдзелу ў жыцці грамадства [1, с. 6].

Ацэнка чытацкай адукаванасці навучэнцаў паказала, што «найбольш высокія вынікі беларускія вучні прадэманстравалі ў заданнях, дзе неабходна было знайсці інфармацыю (справіліся 53,4 %). Да ліку складаных для беларускіх вучняў (справіліся менш паловы тэсціруемых) адносяцца заданні, накіраваныя на вымярэнне кагнітыўных уменняў інтэграваць і інтэрпрэтаваць інфармацыю (разуменне сэнсу), а таксама навыкаў крытычнай ацэнкі і аналітычнага ўсведамлення тэкстаў» [1, с. 26].

Варта адзначыць, што вучэбнымі праграмамі па беларускай мове і літаратуры прадугледжаны віды дзейнасці, якія так ці інакш звязаны з фарміраваннем чытацкай адукаванасці навучэнцаў. У вучэбных дапаможніках падаюцца змешаныя тэксты, арганізаваныя ў параграфы, падпараграфы, дапоўненыя ілюстрацыямі, схемамі, табліцамі. Выбар неабходнага метадычнага інструментарыю залежыць ад настаўніка.

На жаль, прыходзіцца канстатаваць адсутнасць у дзяцей і падлеткаў цікавасці да чытання высокамастацкіх твораў. І тут задача педагога — павысіць праблематызацыю навучання для таго, каб вучні ўсвядомілі мастацкі твор як інструмент пазнання жыцця, як прыклад чалавечага вопыту, асвоілі рацыянальныя прыёмы ўспрымання і пераапрацоўкі інфармацыі, што змяшчаецца ў тэкстах.

Праблемнае навучанне на ўроках літаратуры ажыццяўляецца праз актыўныя метады і прыёмы: вылучэнне праблемных мэт; распрацоўку праблемных пытанняў і заданняў; стварэнне праблемнай сітуацыі; арганізацыю дыскусій; выкарыстанне схем, табліц, памятак, а таксама розных псіхалагічных эфектаў [2, с. 15—17]. Такое навучанне садзейнічае развіццю творчых і камунікатыўных задач, уменняў самастойна мысліць, арыентавацца ў новай сітуацыі, знаходзіць рашэнні; спрыяе фарміраванню такіх кагнітыўных працэсаў, як тлумачэнне і інтэрпрэтацыя, вылучэнне інфармацыі з тэксту, якая не падаецца прама.

Напрыклад, урок літаратуры ў X класе па тэме «Кузьма Чорны. Раман “Пошукі будучыні”» [3] можна пачаць з наступнага праблемнага пытання: «Рыгор Крушына ва ўспамінах пра Кузьму Чорнага пісаў: “А ці не чорны лёс Кузьмы Чорнага?”. Але яго можна сфармуліраваць інакш: “А ці не чорны лёс Кузьмы Чорнага і герояў яго рамана?”». На пачатку ўрока вучні хутчэй за ўсё станоўча адкажуць на гэта пытанне. Але скрупулёзна прааналізаваўшы мастацкі тэкст, біяграфію класіка, яны прыходзяць да іншых высноў. Такое заданне выклікае цікавасць да твора і яго аўтара, імкненне зразумець прачытанае больш глыбока, самастойна прааналізаваць тэкст і, магчыма, прыйсці да нечаканых адказаў.

На ўроку па творы Андрэ Маруа «Пакаранне золатам» (X клас), што прапануецца для дадатковага чытання, ставіцца наступнае праблемнае пытанне: «Звярніце ўвагу на прапанаваную схему. Які знак прыпынку вы паставіце ў канцы сказа? Аргументы занатуйце ў свабодных сектарах».




Такое пытанне адносіцца да задання з адкрытым адказам, які нельга «загугліць у Інтэрнэце», а значыць, яго выкананне патрабуе разумовых дзеянняў ад навучэнцаў. Сітуацыя пераадолення цяжкасцей выклікае цікавасць да твора, жаданне ўзбагаціць свае веды, асэнсаваць той ці іншы матэрыял. Мастацкі тэкст падштурхоўвае іх да аналізу фактаў, свайго жыццёвага вопыту, да ўласных меркаванняў.

Каб актывізаваць пазнавальную дзейнасць вучняў, мэтазгодна выкарыстоўваць праблемныя заданні, пры выкананні якіх патрабуюцца ўменні знаходзіць дадатковую інфармацыю, выкарыстоўваць ужо набытыя веды, занатоўваць і аналізаваць уласны вопыт.

Так, пры вывучэнні твора Якуба Коласа «У палескай глушы» (X клас) вучням даецца наступнае праблемнае заданне: «“Інтэлігенцыя — грамадскі слой адукаваных людзей, якія прафесійна займаюцца разумовай творчай працай, развіццём і распаўсюджаннем культуры” [3]. Ці адпавядаюць гэтай характарыстыцы героі Лінкевіч (“Роднае карэнне” Максіма Гарэцкага) і Лабановіч (“У палескай глушы” Якуба Коласа)? Дапоўніце вашы раз-

важанні характарыстыкай сучаснага інтэлігента. Што змянілася з часам? Характарыстыку герояў занатуйце ў табліцу».

Пазнавальная праблема характарызуецца менавіта тым, што выводзіць навучэнца за межы ўжо вядомых ведаў, патрабуе актыўнай разумовай дзейнасці і творчага падыходу да яе вырашэння.

Пры фармуліроўцы праблемных пытанняў і праблемных заданняў могуць выкарыстоўвацца табліцы, графікі, малюнкі, фотаздымкі і г. д. Падчас вывучэння апавядання Міхася Зарэцкага «Дзіўная» (X клас) вучням можна прапанаваць наступнае міні-даследаванне: «Параўнайце вобраз Шумавай з вобразамі пані Мар'і з твора Янкі Брыля «Сірочы хлеб» і гераіні апавядання Кузьмы Чорнага «Макаркавых Волька» Вашы назіранні занатуйце ў табліцу». (*Ніжэй у табліцы прыведзены прыкладныя адказы.*)

| | Шумава | Пані Мар'я | Волька |
|---|---|---|---|
| Адносіны да сям'і | Чалавечых адносін баіцца, сям'ю не стварае | Мае сям'ю і выхоўвае сваіх дзяцей | Добрая дачка, з павагай і любоўю ставіцца да сваіх бацькоў. Шануе іх памяць |
| Адносіны да дзяцей | Уласнае дзіцё аддае ў дзіцячы дом, сувязі з ім парывае | Любіць і сваіх дзяцей, і чужых. Разумее іх душу, падтрымлівае | Будзе цудоўнай маці, бо расла ў добрай сям'і, дзе панавала любоў і дапамога |
| Адносіны да прафесіі, грамадскай дзейнасці | Прапагандуе ідэю свабоды і сусветнага братэрства, якая яе ламае | Выкладае ўрокі беларускай мовы, хоць уладам гэта не падабаецца. З разуменнем ставіцца да людзей | Добрасумленна выконвае свае абавязкі, нясе людзям толькі дабро і дараванне |
| Вывады | Шумава — гераіня, сапраўды, «дзіўная»: з аднаго боку, смелая, а з другога — бесчалавечная. У параўнанні з іншымі гераінямі — пазбаўленая любові, душы, чалавечнасці. Аўтар не называе яе па імені, а толькі па прозвішчы | | |

Для выканання задання вучням неабходна здабыць інфармацыю з розных крыніц, аргументаваць ацэнку дзеянняў, учынкаў герояў і падзей, зрабіць высновы. У працэсе вырашэння вучэбна-даследчай задачы адбываецца засваенне літаратурнага матэрыялу, а атрыманыя веды дапамагаюць прааналізаваць уласныя дзеянні, прагназаваць сітуацыю, садзейнічаюць фарміраванню духоўна-маральных каштоўнасцей.

Пры знаёмстве з тэмай «Літаратура эпохі Сярэдневякоўя» ў X класе цікавасць у вучняў выклікае візуалізацыя праблемнага пытання. Напрыклад: «Прааналізуйце і параўнайце творы розных відаў мастацтва XX стагоддзя (скульптура і паэзія). Як яны звязаны з эпохай Сярэдневякоўя?».

**Помнік Кірылу Тураўскаму (скульптар М. Іянькоў)**





**«Кірыла Тураўскі» (мастак І. Пратасеня)**

На чыстым аркушы, прад вузенькім акном,
Прыгожа літары выводзіць ён пяром,

Ўстаўляючы паміж іх чорнымі радамі
Чырвоную страку…
І зноў ён схіліцца,
застаўку зноў выводзіць
Нияркім серабром;
нячутна дзень праходзіць;
Ўжо хутка будзе ноч, і першая звязда
Благаславіць канец прыгожага труда.
(*Максім Багдановіч. «Перапісчык»* [5])

Пры вывучэнні тэмы «Літаратура — спецыфічная форма пазнання жыцця народа, выяўлення мастацкага спосабу мыслення. Асноўныя этапы развіцця беларускай літаратуры» ў Х класе заданне можа быць сфармулявана наступным чынам: «Пазначце часавыя межы пэўнага этапу беларускай літаратуры. У кружках намалюйце вобразы-сімвалы, якія адпавядаюць дадзеным перыядам».




Праблематызацыя навучання садзейнічае ўсвядомленаму чытанню, фарміраванню пошукавага стылю мыслення, развіццю здольнасцей доказнага разважання, актывізуе разумовую дзейнасць вучняў, забяспечвае іх агульнакультурнае, асобаснае і пазнавальнае развіццё.

Неабходна адзначыць, што праблемныя пытанні і заданні будуць цікавыя для вучняў толькі ў тым выпадку, калі яны звязаны з рэальным жыццём, калі яны інтрыгуюць. Лёгкае і хуткае знаходжанне адказу зніжае цікавасць да працы.

Пытанні павінны ўтрымліваць пэўную пазнавальную цяжкасць і выразныя межы вядомага і невядомага, пабуджаць да пошуку. Вось тут ставіцца праблемнаая задача ўжо для настаўніка — неабходнасць фармуляваць пытанні і заданні так, каб падтрымліваць цікавасць вучняў да чытання, арыентаваць іх на пошук і вылучэнне патрэбнай інфармацыі, вырашэнне практычных задач. Такая праца забяспечвае высокую самастойнасць навучэнцаў, развіццё іх інтарэса да пазнавальнай дзейнасці, садзейнічае сацыялізацыі.

**Літаратура**

1. *Позняк, А. В.* PISA—2018 в Республике Беларусь. Читательская грамотность / А. В. Позняк ; под ред. Г. С. Ковалёвой. — Минск : Медисонт, 2021. — 68 с.
2. *Руцкая, А. В.* Умовы эфектыўнасці літаратурнага навучання / А. В. Руцкая // Беларуская мова і літаратура. — 2008. — № 12. — С. 15—17.
3. Беларуская літаратура : вучэб. дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / А. П. Бязлепкіна-Чарнякевіч. — Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2020. — 294 с.
4. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / пад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко. — Мінск : БелЭН, 2005. — 784 с.
5. Светлых дзён хараство : зборнік паэтычных твораў для вывучэння беларускай літаратуры ў 10 класе / уклад. А. Спрынчан. — Мінск : Маст. літ., 2021. — 334 с.

*Матэрыял паступіў у рэдакцыю 17.11.2023.*